**А.В.Бадакоў**, *прафесар*

# ПАРАДЫГМЫ СУЧАСНАЙ ГУМАНІТАРНАЙ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Адукацыя як важнейшая, адносна цэласная і самастойная структура соцыуму заўсёды абслугоўвала яго патрэбы. У яе фокусе быў чалавек – суб'ект сацыяльных змен. Таму галоўнымі функцыямі адукацыі былі і застаюцца універсальная сацыялізацыя, развіццё ў чалавека асобасных духоўных і фізічных якасцей, удасканаленне прыродна-генетычных здольнасцей, фарміраванне на падставе сацыякультурнага семантычнага поля чалавека яго сацыяльнай сутнасці.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя абазначыла новыя контуры і новы змест навуковай карціны свету, новае светапогляднае яго разуменне і самога чалавека. Дасягненні прыродазнаўчых, грамадскіх і гуманітарных навук істотна наблізілі адзін да аднаго Сусвет і ўнутраны свет чалавека, удакладнілі месца чалавека ў Сусвеце. Узнік і быў абгрунтаваны так званы антрапакасмалагічны прынцып: космас уяўляецца як аб'ект, у якім чалавек не толькі назіральнік, але і ўдзельнік касмічных з'яў, адна з фундаментальных канстант, што надае спецыфіку і імпульс развіццю Сусвету. Паралельна з вызначэннем антропнага прынцыпу ў разуменні Сусвету да сярэдзіны XX ст. набыў глыбінны характар працэс даследавання самога чалавека. Адбыўся сапраўдны антрапалагічны пераварот. Тым самым быў пераадолены разрыў паміж космасам і чалавекам. Зараз яны разглядаюцца як два бакі адзінага светапарадку. У рэшце рэшт, можа быць, самае галоўнае – абгрунтаваны найбольш значныя модус прызначэння чалавека ў космасе: антыэнтрапійны вектар яго сацыякультурнай дзейнасці. Антыэнтрапійнасць мае вытокі ў духоўнасці чалавека, праз яе яна і рэалізуецца. А гэта значыць, што галоўны вектар актыўнасці чалавека ў свеце зададзены каэвалюцыяй прыроды і сацыякультурнай рэальнасці. Больш таго, ён зададзены сусветнай эвалюцыяй і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

закадзіраваны ў прыродзе і сутнасці чалавека. У выніку сістэма навук аб чалавеку і аб яго сацыякультурнай нішы ў Сусвеце, і навукі аб космасе, і прыродазнаўчыя навукі дазваляюць зрабіць выснову аб тым, што рэалізацыя чалавекам свайго прызначэння ў свеце можа адбыцца толькі шляхам каэвалюцыі, соцыуму, культуры, цывілізацыі, уласнай творчай жыццядзейнасці.

Такім чынам, канцэпцыя арыентацыі сацыякультурнага прагрэсу на "чалавечыя якасці" атрымала дадатковыя аргументы і бясспрэчны характар. Зараз усе вядучыя сацыяльныя рухі і сілы свету прынялі ў якасці імператыву сучаснасці гуманітарызацыю ўсяго жыцця чалавека, і асабліва адукацыі, выхавання, вытворчасці і культуры.

У выніку краіны, якія ўзначальваюць сацыяльны прагрэс, захавалі ў сваім бюджэце вызначаны яшчэ ў 60-я гг. XX ст. значны аб'ём фінансавых і іншых укладанняў у развіццё так званай сферы паслуг. Сярод гэтых паслуг навука і адукацыя атрымалі стратэгічна прыярытэтны характар.

Прыкладна ў другой трэці XX ст. канчаткова вызначылася сістэма парадыгмаў адукацыі і роднасных ёй сфер. Гэта арганічна ўзаемазвязаныя антрапалагічная, сацыяльная і культуралагічная парадыгмы. Кожная з іх фарміруе пэўныя матрыцы дысцыплін, якія ствараюць агульнаадукацыйныя цыклы вучэбных планаў усіх ступеней сучаснай адукацыі. Зразумела, гэтыя цыклы канкрэтызуюцца ў залежнасці ад профілю навучальнай установы. Агульнаадукацыйныя гуманітарныя цыклы дысцыплін выконваюць сваю сацыяльную ролю, калі яны фарміруюцца як цэласныя сістэмы. Толькі ў гэтым выпадку гуманітарны цыкл дысцыплін кожнай вышэйшай навучальнай установы фарміруе асобу, грамадзяніна, свядомага ўдзельніка сацыяльных працэсаў. Менавіта гэты базавы гуманітарны кампанент адукацыі і выхавання і фарміруе сацыяльную сутнасць асобы. Прафесійна-спецыяльны бок адукацыі прызначаны служыць сродкам эфектыўнай рэалізацыі асобай яе творчага патэнцыялу, сваіх сацыяльных роляў у гра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадстве. Апошняе мае сэнс толькі на базе гуманізацыі і гуманітарызацыі адукацыі.

Раней за іншыя дзяржавы пачалі рэалізоўваць вышэйвыкладзеную канцэпцыю ЗША і краіны Захаду. Сусветна вядомыя тыя змены, якія адбыліся ў выніку належнай увагі тых або іншых дзяржаў да гуманітарнай навукі і адукацыі. Сістэма навук, што складае базу сучасных гуманітарных ведаў, уключае антрапалагічныя, сацыяльна-біялагічныя (сацыяінжынерыя, біясацыялогія, біяэтыка, сацыяэталогія і інш.), культуралагічныя навукі і футуралогію, геапалітычныя дысцыпліны і самастойныя галіны даследавання. Дарэчы, менавіта гэты цыкл навук як ядро гуманітарызацыі яшчэ не асэнсаваны належным чынам многімі краінамі. Актуальнай гэта праблема застаецца і для краін постсавецкай прасторы, у тым ліку і Рэспубліцы Беларусь. Зараз краіны свету сталі на шлях бесперапыннага рэфармавання адукацыі. Многае робіцца ў дадзеным кірунку і ў Рэспубліцы Беларусь. Але, на наш погляд, гэтай справе ўсё яшчэ ўласцівы традыцыйныя недахопы. Згадаем некаторыя з іх. Яшчэ не знойдзены оптымум спалучэння гуманітарнага, прыродазнаўчага і тэхнікатэхналагічнага кампанентаў у розных ВНУ. Акрамя таго, застаецца нявызначаным змест гуманітарнага цыкла ў якасці цэласнай сістэмы навук, якія фарміруюць светапогляд падрастаючых пакаленняў. Напрыклад, у яго складзе амаль поўнасцю адсутнічаюць антрапалагічныя навукі: тэарэтычная антрапалогія, а таксама філасофская, культурная, сацыяльная і гістарычная антрапалогія, генетыка чалавека, тэарэтычная дэмаграфія, космапсіхалогія, трансперсанальная псіхалогія, праблемы планетарызацыі свядомасці і інш. Не прадстаўлены такія важныя галіны сацыяльных навук, як глабалістыка, геапалітыка, тэарэтычная і прыкладная футуралогія, сацыяльная інжынерыя, праблемы спецыфікі сучаснага сацыяльнага прагрэсу і інш.

Вельмі бедна ў гуманітарным цыкле ВНУ прадстаўлены культуралагічныя веды. Гаворка ідзе аб семантыцы культуры, узаемадзеянні ўлады і культуры, праблемах інфарматызацыі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

культуры, сучаснага культурнага прагрэсу, культурнай творчасці, рэлігійных вытокаў культуры і інш. А між тым веды, якія складаюць змест вышэйназваных навук, адыгрываюць прыярытэтную ролю ў фарміраванні духоўнага патэнцыялу і сістэмы каштоўнасцей не толькі асобы, але і сацыяльных супольнасцей – этнасаў нацый, краін і іх аб'яднанняў. Больш таго, краіны – лідэры сацыяльнага развіцця – выкарыстоўваюць у цяперашні час дасягненні гэтых і іншых гуманітарных навук у мэтах замацавання свайго лідзіруючага становішча.

Беручы пад увагу усё вышэйвыкладзенае, неабходна ў мэтах далейшага гарманічнага развіцця нашай краіны вырашыць некалькі праблем, без якіх рэформа адукацыі не будзе плённай:

– больш выразна і канкрэтна вызначыць контуры нацыянальнай беларускай ідэі, стратэгічныя мэты дзяржавы і прыярытэты нашага сацыякультурнага развіцця;

– разгарнуць навуковыя даследаванні ў галіне вышэйзгаданых навук і праблем, якія б змаглі скласці тэарэтычную аснову палітыкі комплекснага сацыякультурнага развіцця краіны;

– з улікам неабходнасці вырашэння нацыянальна-рэгіянальных праблем трэба адказна падысці да фаміравання зместу адукацыі на ўсіх ступенях, маючы на ўвазе сучасныя дасягненні гуманітарных і прыродазнаўчых ведаў, вызначыць той духоўны патэнцыял і прафесійную падрыхтоўку кожнай асобы, якія дазволяць нам паспяхова ісці па шляху сацыяльнага прагрэсу, заняць дастойнае месца сярод іншых нацый;

– дапрацаваць з улікам уласнага і замежнага вопыту праекты рэформаў адукацыі, у якіх побач з вызначэннем яе сучаснага зместу, былі б акрэслены меры па падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў, здольных на ўзроўні сусветных узораў працягваць даследаванне найбольш актуальных і перспектыўных праблем чалавеказнаўства;

– асобная ўвага павінна надавацца метадам адукацыі і самаадукацыі – дыялога-інфармацыйным, масаваму выкарыстанню Internet, сучасным інфармацыйным тэхналогіям навучання;

– арганізаваць беспярапыннасць адукацыі і выхавання з улікам магчымасцей навучэнцаў;

– забяспечыць прыярытэтны характар выдаткаў на адукацыю ў бюджэце дзяржавы, пры гэтым павінны быць вызначаны крыніцы прыцягнення фінансавых сродкаў як ад грамадзян, так і ад грамадскіх аб'яднанняў, фондаў, спонсараў. Прадметам асобых клопатаў дзяржавы і грамадства павінны стаць пошук таленавітай моладзі і ўключэнне яе ў найбольш эфектыўныя бясплатныя формы адукацыі. Галоўную ролю ў гэтым кірунку належыць надаць творчым школам у навуцы, адукацыі, выхаванні, у кіраўніцтве, мастацтве і інш. Вопыт паказвае, што такія школы, калі яны ўзначальваюцца таленавітымі асобамі, акумулююць вопыт развіцця ў моладзі творчых якасцей, характарызуюцца "пранікненнем у будучыню", інавацыйнымі пошукамі. Вывучэнне гэтай галіны жыццядзейнасці нашага народа, падтрымка яе, пераўтварэнне ў інструмент вырашэння стратэгічных праблем сацыяльнага прагрэсу павінны стаць першачарговым клопатам дзяржавы і ўсіх яе ўстаноў, арганізацый і асобных дзеячаў.

**В.І.Баравік**, *ст. выкладчык*

## РАЗВІЦЦЁ ЛІНГВІСТЫЧНАЙ, САЦЫЯЛІНГВІСТЫЧНАЙ І САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ СТУДЭНТАЎ ВА ЎМОВАХ КАМУНІКАТЫЎНАГА ПАДЫХОДУ ДА ВЫКЛАДАННЯ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ

Камунікатыўны падыход дапамагае выклікаць у навучэнца жаданне вывучыць замежную мову шляхам выкарыстання і развіцця сваіх ведаў і вопыту. Дзякуючы матэрыялу тэм, якія цікавяць навучэнца, мабілізуюцца яго інтарэсы ў пастаноўцы задач, што адпавядаюць мэце навучання, садзейнічаюць развіццю здольнасцей да зносін з суразмоўнікам.